Падтрымай "Вясну" на PATREON

Барысаў: За патрабаванне адстаўкі Міністра абароны Мацкевіча і Абрамовіча пакаралі штрафамі дапоўнена

30.10.2017 **Тэгі**: свабода мірных сходаў, затрыманні



Плакат, з якім Алег Мацкевіч выйшаў на пікет 30 кастрычніка ў Барысаве.

Супрацоўнікі барысаўскай міліцыі затрымалі праваабаронцу **Алега Мацкевіча**, які выйшаў сёння пікет, каб патрабаваць адстаўкі Міністра абароны РБ **Андрэя Раўкова** і прыцягнення да крымінальнай адказнасці ўсіх вінаватых у смерці салдата тэрміновай службы **Аляксандра Коржыча**. Разам ім пікетаваў актывіст **Алесь Абрамовіч**, які таксама затрыманы.

Перад гэтым на сваёй старонцы ў фэйсбуку Мацкевіч змясціў фота плаката і лаканічны подпіс:

> Кажуць, што ў чалавека заўсёды ёсьць выбар. Сёньня ў мяне яго няма. Я пайшоў...
>
> Aleh Mackievič

Нагадаем, 13 кастрычніка Алег Мацкевіч накіраваў у Барысаўскі гарадскі выканаўчы камітэт заяўку на правядзенне 30 кастрычніка пікету на цэнтральнай плошчы горада, насупраць будынку Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання. Нагодай для гэтага стала трагічная гібель салдата ў барысаўскіх Пячах.

Барысаўскі выканкам адмовіў праваабаронцу Алегу Мацкевічу ў правядзенні пікета 30 кастрычніка.

Акцыя пачалася ў 12 гадзін і доўжылася хвілін 15, затым да пікетоўцаў падыйшоў супрацоўнік міліцыі ў званні капітана і паведаміў ім аб затрыманні.

Пакуль вядома, што праваабаронцу **Алега Мацкевіча, Алеся Абрамовіча,** галоўнага рэдактара "Барысаўскіх навін" **Анатоля Букаса,** і фотажурналіста сайта ex-Press.by **Паўла Сляпухіна** якія знаходзіліся побач з пікетоўцамі, даставілі ў Барысаўскі РАУС.

Анатоля Букаса і журналіста Сляпухіна пасля праверкі дакументаў адпусцілі, а на астатніх склалі пратаколы адміністратыўнага правапарушэння. У гэты ж дзень адбыўся і суд над удзельнікамі пікету: Алегу Мацкевічу за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (арт. 23.34 КаАП) суддзя Барысаўскага раённага суда **Сяргей Герасімовіч** прысудзіў штраф у памеры 30 базавых велічынь, а Алесю Абрамовічу - 50 базавых велічынь.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"









АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды ператварыліся ў функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла асноўную атаку" Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY